ми факторами, которые тормозят изучение русского языка на начальном этапе.

В свете вышесказанного следует отметить, что современная методическая наука все чаще говорит о посткоммуникативном, национально ориентированном подходе в изучении иностранного языка. В соответствии с ним, студентам из КНР необходима систематическая и поэтапная работа над русской фонетикой и орфоэпией в течение всего года, а не только на этапе изучения вводно-фонетического курса. Такая работа, основанная на подборе актуальных именно для студентов из Китая дидактических материалов и фонетических игр, несомненно, даст ожидаемый результат.

1. *Алексахин, А. Н.* О китайских фонологических системах в межцивилизационном контакте Востока и Запада : проект монографического исследования / А. Н. Алексахин // Филологические науки в МГИМО : сб. науч. тр. № 24 (39) ; отв. ред. Г. И. Гладков. – М., 2006. – С. 6–18.

2. *Просвирнина, И. С.* Обучение фонетике русского языка / И. С. Просвирнина // Изв. Урал. гос. ун-та. – 2004. – № 33. – С. 46–60.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**С. В. Зыгмантовіч,** *загадчык кафедры*
*менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Стратэгічнай мэтай дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі на сучасным этапе з’яўляецца павышэнне даступнасці якаснай адукацыі, якая б адпавядала сучасным патрабаванням інавацыйнага развіцця эканомікі, грамадства і кожнага грамадзяніна. Адным з інструментаў рэалізацыі азначанай мэты з’яўляюцца дзяржаўныя адукацыйныя стандарты.

Метадалагічнай асновай адукацыйнага стандарту трэцяга пакалення выступае кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Значнасць кампетэнтнаснага падыходу для прафесійнай падрыхтоўкі заключаецца ў прывядзенні набываемай студэнтам адукацыі ў адпаведнасць з патрэбамі прафесійнай сферы. Кампетэнтнасны падыход пра-

дугледжвае канкрэтную фармулёўку мэт навучання як кампетэнцый, запатрабаваных у прафесійнай дзейнасці сучаснага спецыяліста і засвойваемых навучэнцамі. Тым самым кампетэнтнасны падыход забяспечвае адпаведнасць падрыхтоўкі запытам рынку працы, павышае канкурэнтаздольнасць выпускнікоў, эфектыўнасць іх прафесійнай адаптацыі і дзейнасці.

Значнасць дадзенага падыходу для арганізацыі адукацыйнага працэсу заключаецца ў тым, што ён ляжыць у аснове вызначэння як мэты працэсу навучання, так і ацэнкі вынікаў засваення асноўных адукацыйных праграм, да якіх адносяцца не толькі традыцыйныя веды, уменні і навыкі, але найперш кампетэнцыі.

У дзяржаўным адукацыйным стандарце па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць пад кампетэнцыяй разумеюцца веды, вопыт і асобасныя якасці, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач; а кампетэнтнасць – гэта здольнасць прымяняць свае веды і ўменні [2].

У прафесійнай педагогіцы сёння адрозніваюць кампетэнцыі ад ведаў, уменняў, навыкаў, якія, з аднаго боку, характарызуюць адрозненні кампетэнтнаснага падыходу да навучання ад традыцыйнага ведавага, а з іншага, дапамагаюць пры распрацоўцы адукацыйных праграм, вучэбных праграм дысцыплін, навукова-метадычнага забеспячэння працэсу навучання [7, с. 125–126].

Сярод кампетэнцый, якімі павінны валодаць выпускнікі, у адукацыйным стандарце вылучаны групы кампетэнцый: 10 акадэмічных кампетэнцый (АК); 7 сацыяльна-асобасных кампетэнцый (САК) і 22 прафесійныя кампетэнцыі (ПК). Апошнія падзяляюцца на групы ў залежнасці ад відаў прафесійнай дзейнасці: вытворча-тэхналагічныя; сацыяльна-культурныя; інавацыйна-метадычныя; навукова-даследчыя; арганізацыйна-кіраўнічыя.

Пры разглядзе пытання аб прафесійных бібліяграфічных кампетэнцыях неабходна ўдакладніць некалькі момантаў. Папершае, адукацыйны стандарт арыентаваны на падрыхтоўку бібліятэкараў і бібліёграфаў, якіх можна разглядаць і як самастойныя кваліфікацыі, што адпавядаюць асобным прафесіям, і як базісныя кваліфікацыі ў параўнанні з кваліфікацыямі ў залежнасці ад напрамкаў спецыяльнасці. Таму пералічаныя ў стандарце прафесійныя кампетэнцыі, таксама як і акадэмічныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сацыяльна-асобасныя, прадстаўлены ў агульным выглядзе для сумежных кваліфікацый. Больш дакладны і глыбокі аналіз спецыфікі бібліяграфічнай працы дазволіць канкрэтызаваць прафесійна значныя кампетэнцыі для бібліёграфаў. Па-другое, у сувязі з тым што «бібліяграфічная функцыя» з'яўляецца скразной для дзейнасці ўсіх тыпаў бібліятэк, для супрацоўнікаў розных структурных падраздзяленняў бібліятэк, бібліяграфічны элемент імпліцытна прысутнічае у структуры прафесійных кампетэнцый бібліятэкараў.

На жаль, у спецыяльным друку не надаецца дастатковай увагі разгляду кампетэнтнасці бібліёграфаў, бібліяграфічных кампетэнцый спецыялістаў сістэмы дакументных камунікацый, у тым ліку і бібліятэкараў. Наадварот, мадэрнізацыя дзейнасці бібліятэк пад уплывам сучасных інфармацыйных тэхналогій прыводзіць да пошуку і вызначэння новых кваліфікацый і для бібліятэчнай сферы, напрыклад рэферэнт-аналітык, менеджар інфармацыйных рэсурсаў і інш. Праведзены даследчыкамі аналіз паказаў, што ў многіх краінах сістэма бібліятэчнай адукацыі трансфармуецца за кошт інтэграцыі дзвюх сфер – бібліятэчнай і інфармацыйнай, або за кошт узмацнення інфармацыйнага элемента ў традыцыйнай бібліятэчнай сферы (падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па кірунках «бібліятэчныя і інфармацыйныя навукі», «бібліятэчны і інфармацыйны менеджмент», прапаноўваюцца доктарскія праграмы па бібліятэказнаўстве і інфармацыйным навукам) [5, с. 124].

Азначаная тэндэнцыя знайшла адлюстраванне і ў нашай краіне. Змена назвы спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» на «бібліятэчна-інфармацыйную дзейнасць» адпавядае сусветным тэндэнцыям. Акрамя таго, аб узмацненні інфармацыйнага элемента сведчыць і аналіз фармулёвак зместу прафесійных кампетэнцый, якія вызначаны ў дзяржаўным адукацыйным стандарце, з выкарыстаннем інтэгратыўных тэрмінаў «бібліятэчна-інфармацыйныя працэсы», «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» і інш. Вучэбныя дысцыпліны, пералічаныя ў стандарце, таксама адлюстроўваюць праблематыку комплекснага характару, уключаючы і дакументазнаўчыя, і бібліятэказнаўчыя, і бібліяграфазнаўчыя, і інфармацыйныя аспекты (напрыклад, «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» і інш.). Адзначым, што замена назвы спецыяльнасці ў адукацыйным стандарце з тэрмінаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязаных з навукамі, на дзейнасны падыход таксама адпавядае сусветным адукацыйным тэндэнцыям арыентацыі на кампетэнтнасныя мадэлі падрыхтоўкі спецыялістаў.

У адукацыйным стандарце бібліяграфічны элемент страціў чысціню і аўтаномнасць, але дадзеная тэндэнцыя не павінна разглядацца як знікненне бібліяграфічных форм дзейнасці, бібліяграфічных працэсаў, бібліяграфічных сродкаў.

Паспрабуем даць азначэнне бібліяграфічнай кампетэнтнасці ў кантэксце падрыхтоўкі будучых бібліятэчных кадраў і вызначыць яе галоўныя элементы ў адпаведнасці з асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці. Неабходнасць канкрэтызацыі прафесійных бібліяграфічных кампетэнцый выклікана неадпаведнасцю паміж зместам адукацыйнай праграмы «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» і высокім узроўнем абагульненасці, комплекснасці пералічаных у адукацыйным стандарце патрабаванняў да выпускнікоў дадзенай праграмы, прадстаўленым у выглядзе прафесійных кампетэнцый.

Бібліяграфічная кампетэнтнасць – гэта гатоўнасць выкарыстоўваць засвоеныя веды, вучэбныя ўменні і навыкі, а таксама спосабы і вопыт дзейнасці па забеспячэнні функцыянавання бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве з мэтай арганізацыі ведаў, назапашаных чалавецтвам, і арыентацыі ў іх розных катэгорый карыстальнікаў.

Паняцце прафесійнай бібліяграфічнай кампетэнтнасці будучага бібліятэкара можна вызначыць як аваладанне неабходнай сумай ведаў, уменняў і навыкаў, асобасных характарыстык, якія вызначаюць здольнасць прадуктыўна выконваць бібліяграфічныя працэсы і выкарыстоўваць бібліяграфічныя метады і сродкі ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

У адпаведнасці з асаблівасцямі зместу бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы на падставе выкарыстання метадалогіі структурнага аналізу і мадэлявання, асновай для чаго з'явіліся кваліфікацыйныя характарыстыкі пасад супрацоўнікаў сферы культуры і мастацтва [6], сярод галоўных прафесійных бібліяграфічных кампетэнцый у галіне вытворча-тэхналагічнай дзейнасці можна вызначыць наступныя здольнасці: выконваць асноўныя тэхналагічныя бібліяграфічныя працэсы ў бібліятэках; адлюстроўваць на другасным узроўні дакументы і электронныя рэсурсы; каталагізаваць, індэксаваць дакументы і электронныя рэсурсы ў адпаведнасці з выкарыстоўваемымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стандартамі, фарматамі і правіламі; фарміраваць даведачна-бібліяграфічны апарат у традыцыйным і аўтаматызаваным рэжыме; выкарыстоўваць як лакальныя, так і аддаленыя інфармацыйныя рэсурсы ў бібліятэчна-бібліяграфічных працэсах; ажыццяўляць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае інфармаванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці ў рэжымах лакальнага і аддаленага доступу; ажыццяўляць падрыхтоўку бібліяграфічных і інфармацыйных матэрыялаў, стварэнне і вядзенне баз даных; фарміраваць бібліяграфічную (састаўную частку інфармацыйнай) культуру карыстальнікаў.

У галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці можна вызначыць здольнасці па інфармацыйна-бібліяграфічным забеспячэнні адукацыі, культуры, выхавання, самаадукацыі, свабоднага развіцця асобы і чытання; у галіне інавацыйна-метадычнай дзейнасці – здольнасці па выяўленні і генерыраванні бібліяграфічных навацый, іх распаўсюджанні з дапамогай розных форм метадычнага забеспячэння бібліяграфічнай практычнай дзейнасці бібліятэк; у сферы навукова-даследчай дзейнасці – здольнасці прымаць удзел у навуковых даследаваннях у галіне бібліяграфіі і рэалізоўваць іх вынікі; у сферы арганізацыйна-кіраўніцкай – здольнасці да рэалізацыі функцый кіравання ў дачыненні да бібліяграфічнай работы і дзейнасці бібліяграфічных структурных падраздзяленняў бібліятэкі (па распрацоўцы і рэалізацыі бягучых і перспектыўных планаў, праектаў, праграм, нарматыўных дакументаў і тэхналогій у галіне бібліяграфічнай дзейнасці).

Фарміраванне бібліяграфічных кампетэнцый забяспечваецца выкладаннем такіх дысцыплін, як «Бібліяграфазнаўства», «Інфармацыйныя рэсурсы. Каталагізацыя дакументаў», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», комплексных галіновых курсаў у складзе дысцыпліны «Інфармацыйныя рэсурсы», пабудаваных на падставе кампетэнтнаснага падыходу.

Акрамя базавых агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін у стандарце прадугледжаны дысцыпліны па напрамках спецыяльнасці, дысцыпліны, якія ўваходзяць у кампанент установы вышэйшай адукацыі, курсы па выбары, факультатыўныя курсы. Іх аналіз сведчыць, што апошнім часам скарачаецца колькасць дысцыплін выключна бібліяграфічнага зме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сту. Разам з тым, на нашу думку, рэалізацыя комплекснага падыходу, на якім пабудаваны дзяржаўны адукацыйны стандарт, можа знайсці працяг і ў змесце пералічаных вышэй груп дысцыплін. Прыкладам такой інтэграцыі бібліятэчна-бібліяграфічна-інфармацыйнага зместу з'яўляецца прапанаваная кафедрай менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы для падрыхтоўкі спецыялістаў па кірунку «менеджмент» дысцыпліна «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці», якая складаецца з некалькіх раздзелаў-модуляў. Сярод модуляў бібліятэчнай накіраванасці – псіхалагічныя аспекты чытання, сацыялогія чытання, бібліятэчная педагогіка, бібліятэчная сацыяноміка. Модуль, прысвечаны бібліяграфічнаму элементу, уключае такія змястоўныя аспекты, як тэарэтычныя аспекты педагагічнага патэнцыялу бібліяграфічнай дзейнасці, рэалізацыя педагагічных падыходаў у працэсах бібліяграфічнага абслугоўвання і фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў, спецыфіка бібліяграфічных зносін у сістэме бібліятэчных камунікацый, рэкамендацыйная бібліяграфія ў сістэме сродкаў педагагічнай дзейнасці бібліятэк – у падтрымцы і развіцці чытання.

Кампетэнтнасны падыход да бібліяграфічнай падрыхтоўкі будучых бібліятэчных кадраў садзейнічае ўзмацненню практыка-арыентаванай накіраванасці выкладаемых дысцыплін, гатоўнасці студэнтаў да вырашэння бібліяграфічных задач, рэалізацыі бібліяграфічных функцый, працэсаў не толькі ў бібліятэчнай сферы, але і ў любой іншай, дзе ствараюцца, выкарыстоўваюцца, распаўсюджваюцца крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі [3; 4].

Разам з тым выкарыстанне кампетэнтнаснага падыходу пры пераводзе працэсу навучання на новы адукацыйны стандарт і распрацоўцы новага пакалення вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнай праграмы патрабуе вырашэння шэрагу праблем. Актуальнымі з'яўляюцца: наладжванне міжкафедральных сувязей пры выкладанні бібліяграфічных і інтэграваных курсаў; вызначэнне міждысцыплінарных сувязей не толькі ў змесце курсаў, але і ў пераліку практычных, лабараторных заняткаў, заданняў для самастойнай работы студэнтаў і ўстанаўлення іх адпаведнасці фарміруемым уменням, навыкам і здольнасцям, вызначаным у адукацыйным стандарце; распрацоўка дыягнастычнага інструментарыю для аб'ектыўнай ацэнкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сфарміраваных кампетэнцый пры больш шырокім выкарыстанні заданняў па праверцы ўменняў і навыкаў, а не толькі ведаў; фарміраванне надзейнага інфармацыйнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння выкладаемых дысцыплін на базе сучасных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій (падрыхтоўка электронных падручнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў, тэставых заданняў для самаправеркі і інш.); цесная сувязь з базавымі арганізацыямі; распрацоўка інавацыйных практычных заняткаў і заданняў з улікам перадавога вопыту лепшых бібліятэк розных краін і накіраванасці вучэбнага працэсу на падрыхтоўку бібліяграфічных прадуктаў, паслуг, якія могуць быць запатрабаванымі як у адукацыйным працэсе, так і ў практычнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Бігеза, В. М.* Адметнасці бібліяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў завочнага навучання ва ўмовах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці / В. М. Бігеза, С. В. Зыгмантовіч // Удасканаленне дзейнасці кафедраў па прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў на факультэце завочнага навучання : матэрыялы навук.-метад. канф., 2 лют. 2012 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – С. 42–47.

2. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 04 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) [Электронны рэсурс] // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Рэжым доступу : http://pravo.by. – Дата доступу : 08.02.2016.

3. *Зыгмантовіч, С. В.* Актыўныя метады практыка-арыентаванай бібліяграфічнай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў / С. В. Зыгмантовіч // Якасць вышэйшай адукацыі: сучасны стан і тэндэнцыі развіцця : матэрыялы навук.-метад. канф., 4–5 лют. 2014 г. – Мінск : БДУКМ, 2015. – С. 132–136.

4. *Зыгмантовіч, С. В.* Інавацыйная адукацыйная дзейнасць па бібліяграфічнай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай адукацыі: навукова-метадычнае забеспячэнне / В. М. Бігеза, С. В. Зыгмантовіч // Навук.-метад. і інфарм. суправаджэнне падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры і мастацтва : матэрыялы навук.-метад. канф., 3 лют. 2010 г. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 15–21.

5. *Караваева, Е. В.* Нормативно-методические основы формирования образовательных программ стандартов нового поколения в области культуры / Е. В. Караваева [и др.] // Вестн. ТГУ. – 2009. – № 6 (74). – С. 123–129.

6. Квалификационный справочник «Должности служащих, занятых в сфере культуры и искусстве» (в ред. постановлений Минтруда и соцзащиты от 22.08.2003 № 97, от 15.12.2009 № 149) [Электронный ресурс]. –

Режим доступа : http://www.helper.by/component/option,com_jdownloads. – Дата доступа : 16.01.2016
*7. Сбитнева, Г. И.* Формирование профессиональных компетенций в курсе «Отраслевые информационные ресурсы» / Г. И. Сбитнева // Вестн. Кемеров. гос. ун-та культуры и искусств. – 2011. – № 15. – С. 125–129.

**Н. В. Карчевская,**
*доцент кафедры хореографии,*
*кандидат искусствоведения, доцент;*
**С. А. Гродникова,**
*концертмейстер кафедры хореографии,*
*магистр искусствоведения*

## ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ ОСНОВНЫХ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ У СТУДЕНТОВ НАПРАВЛЕНИЯ СПЕЦИАЛЬНОСТИ «ХОРЕОГРАФИЧЕСКОЕ ИСКУССТВО (ЭСТРАДНЫЙ ТАНЕЦ)» В ХОДЕ ИЗУЧЕНИЯ ДИСЦИПЛИНЫ «ИСКУССТВО БАЛЕТМЕЙСТЕРА»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Современные тенденции развития хореографического искусства, стремительное изменение его эстетики, усиливающееся взаимодействие с другими художественными и внехудожественными пластами обусловливают необходимость формирования нового типа художественно-творческого мышления в процессе профессионального обучения. Особая роль в формировании основных профессиональных компетенций принадлежит дисциплине «Искусство балетмейстера», преподавание которой для каждого направления специальности «хореографическое искусство» имеет свою специфику.

Особенности формирования основных профессиональных компетенций в ходе преподавания дисциплины «Искусство балетмейстера» определяются в первую очередь спецификой этой разновидности хореографического искусства. Сложность обучения балетмейстерскому мастерству в сфере эстрадного танца связана с тем, что сам он находится в зоне пересечения двух видов искусства – хореографии и эстрады. Балетмейстер, работающий в эстрадном танце, сталкивается с проблемой не-